***Прывітанне, мае шаноўныя сябры.***
***За вокнамі -  красавік, які абяцае нам цяпло сонечных промняў, зялёную сакавітасць травы ды пяшчоту першацветваў.***
***І ўжо не трэба запальваць святло, каб пацiху прабрацца на кухню і ранішняй цішынёю зрабіць сабе кубачак духмянай кавы ці гарбаты.***
***Раней на кожнай кухні вісеў перакладны каляндарык  і можна было ў гэтыя ранішнія хвілінкі пагартаць яго старонкі….***
***Давайце і мы зазірнем у літаратурны каляндар красавіка***



23 красавіка 1886 года ў мястэчку Пасадзец Віленскага павета Віленскай губерні (цяпер вёска Пасадзец Лагойскага раёна Мінскай вобласці) нарадзіўся Змітрок Бядуля (сапраўднае імя Плаўнік Самуіл Яфімавіч). Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1934  г.

Значнай з'явай у беларускай літаратуры стала аповесць Змітрака Бядулі “Салавей”, прысвечаная  дзікім часам прыгоннага права.

У аповесці “Салавей”, якая вызначаецца своеасаблівым рамантычным каларытам і мае глыбокія фальклорныя вытокі, у яркіх вобразах і карцінах аўтар паказаў эпоху прыгоннага права на Беларусі, барацьбу беларускіх сялян з прыгоннікамі, апаэтызаваў таленавітых і валявых народных самародкаў.

У 1937 годзе на сцэне Купалаўскага тэатра з выключным поспехам прайшла прэм'ера спектакля «Салавей».

Па матывах гэтай аповесці Міхаілам Крошнером пад кіраўніцтвам дырыжора Іллі Гітгарца быў пастаўлены першы беларускі балет “Салавей”  Прэм'ера адбылася 11 мая 1939 гада на сцэне Мінскага тэатра оперы і балета.

Літаратурная спадчына З. Бядулі багатая і жанрава разнастайная. Лепшыя яго творы адносяцца да класічных здабыткаў беларускага мастацкага слова. У «залаты фонд» беларускай літаратуры ўвайшлі апавяданні “На Каляды да сына”, “Велікодныя яйкі”, “Летапісцы”. Некаторыя з іх вывучаліся ў рамках школьнай праграмы.

Памёр беларускі празаік і паэт 3.11.1941, каля г. Уральска, куды пераехаў, уцякаючы ад фашысцкай акупацы і быў пахаваны ва Уральску. Тады беларускага літаратара  хаваў Коласаўскі тэатр, які ў гэты час быў у горадзе.

3 лістапада 2020 года (амаль праз 80 год) прах Змітрака Бядулі  ўрачыста перапахаваны  на Усходніх могілках Мінска, дзе пахаваныя такія велічныя стаўпы  беларускай культуры як Уладзімір Караткевіч і  Васіль Быкаў.

**Змітрок Бядуля - Плач пралескаў**

Плакалі пралескі, дзеці вясны… Гэта раса на кволых пялёстках! – пяяў жаўранак і кружыўся над імі… Фарбаваныя небам, узгадаваныя сонейкам, яны на чорнай зямлі не хацелі перажыць нават ад маладзіка да ветаха вясенняга месяца… плакалі ды плакалі… Месцамі па лагчынах лядок стаяў, месцамі траўкі зазеляняліся…

…………………………………………………………………………………………………

Новыя дарогі панёс на плячах араты ад каваля; дзяцюк ахвотна быкоў накарміў. Палала зарніца над бярэзнікам. У вёсцы з закураных каміноў круціўся ўверх, быццам кудзеля, белы дым – гаспадыні сняданне рыхтавалі.

Выйшла дзяўчына першы раз босая ў чыстае поле; убачыла, як палескі слёзы льюць, ды сама заплакала.

– Ой, мяне за нямілага замуж выдаюць!  Ой, пагубіла я леты маладыя свае!..

Абхапіла рукамі бярозку маладую ды абамлела разам з ёй…

А вакол плакалі пралескі, дзеці вясны…